# Калейдаскоп падзей



## Дзеля дзіцячых усмешак

На сайце дабрачыннай арганізацыі "Твая перспектыва" можна даведацца аб тым, што яна курыруе ўсе спецыяльныя дзённыя цэнтры на тэрыторыі Беларусі, дзейнасць якіх накіравана на дабрыню, падтрымку і дапамогу тым, каму яны вельмі неабходныя. Такі цэнтр з 2016 года існуе і ў нашым горадзе — працуе пры Жабінкаўскай царкве ЕХБ. Там займаюцца з дзеткамі, што выхоўваюцца ў сем'ях, якія апынуліся ў цяжкім жыццёвым становішчы. У няпростай эпідэміялагічнай сітуацыі такім хлопчыкам і дзяўчынкам патрэбна асаблівая ўвага. Яны будуць удзячныя элементарнаму — таварам першай неабходнасці і прадуктовым наборам. Калі ў вас ёсць жаданне і магчымасць прыняць удзел у добрай справе, то не застаньцеся ўбаку.

## Віват, футбольны клуб!

28 мая 2018 года на Жабінкаўшчыне з'явіўся футбольны клуб "Цукровы". Менавіта ў той дзень ягоныя ўдзельнікі правялі паспяховы матч — перамаглі з лікам 6:1. З таго часу прайшло два гады, і вось клуб адзначыў ужо другі дзень нараджэння! Ён аб'яднаў верных аматараў футболу living рознага ўзросту. За іх плячыма як перамогі, так і паражэнні, але першых усё ж такі больш. У камандзе лічаць, што свята аб'ядноўвае не толькі яе ўдзельнікаў, але й балельшчыкаў, якія шчыра падтрымліваюць. ФК "Цукровы" абяцае не спыняцца на дасягнутым і радаваць сваіх прыхільнікаў новымі поспехамі.

## Лавілася рыбка

У сацыяльных сетках аматараў рыбнай лоўлі Жабінкаўшчыны аб'яднала група "Zhabinka Fishing Club". У апошні дзень вясны 15 яе прадстаўнікоў вырашылі пасупернічаць у майстэрстве на беразе Мухаўца. Спаборніцтвы па фідэрнай лоўлі арганізавалі жабінкаўцы Сяргей Пятручык і Яўген Царук. Пасля жараб'ёўкі аматары прыняліся за любімую справу, час за якой ляціць непрыкметна, але прыйшла пара ўзважваць улоў. Найцяжэйшы аказаўся ў Івана Кужка, крышку менш пашчасціла ў той дзень Сяргею Нагару і Віктару Пятручыку, а замыкаў групу лідараў гэтай няпростай, але цікавай справы Аляксандр Якімук. Ва ўловах пераважалі падлешчыкі, акунькі, ёршыкі. Спонсарамі спаборніцтваў выступілі ўладальнікі рыбалоўных магазінаў у Жабінцы Іван Булыга і Мікалай Ляшук, якія прадаставілі прыемныя падарункі.

## Цуды ў Сяхновічах

У Жабінкаўскім раённым гісторыка-краязнаўчым музеі дзейнічае незвычайная выстава. Яе разынка ў тым, што ўсе экспанаты знаходзяцца пад адкрытым небам. У экспазіцыі "Бабуліны цуды" прадстаўлены тыя рэчы, якімі сяляне карысталіся ў быце. Да ўсяго можна дакрануцца, а яшчэ зрабіць цікавае фота на памяць. За наведванне выставы не трэба плаціць грошы. Паглядзець яе можна да 10 чэрвеня.

## Юныя мастачкі са школы № 2

Трэцякласнікі другой гарадской школы на працягу навучальнага года актыўна ўдзельнічалі ў шматлікіх алімпіядах і конкурсах. У апошні дзень вясны, акурат напярэдадні летніх канікулаў, пераможцы атрымалі ўзнагароды і падарункі. Так, напрыклад, дыпламантамі конкурсу дзіцячага малюнка ў межах праекта "Чыстая рака — галоўны прыярытэт" сталі Маргарыта Лугаўцова, Соф'я Царук і Яна Гацкевіч. Таксама ў ліку пераможцаў — Валерыя Заяц і Вікторыя Масіевіч. Уручыў узнагароды дзяўчынкам начальнік вытворчага аддзела КУШВП ЖКГ "Жабінкаўская ЖКГ" Аляксандр Кандрацюк.




Фота Святланы КІСЛАЙ

**ДЭПУТАТ У АКРУЗЕ**



## Падарункі дашкалятам

— Першы дзень лета — гэта не толькі пачатак летніх канікул, але і Міжнародны дзень аховы дзяцей. Аднак гэта не толькі вясёлае свята для саміх хлопчыкаў і дзяўчынак, але і нагаданне грамадству аб неабходнасці ахоўваць правы дзіцяці, каб дзеці займаліся любімай справай і ў будучыні сталі выдатнымі бацькамі і грамадзянамі сваёй краіны, — лічыць дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па Белавежскай выбарчай акрузе №8 Жанна Стаціўка.

Каб гэтае свята запомнілася юным жабінкаўцам, памочнік дэпутата Уладзімір Андранка даставіў прыемныя падарункі ад Жанны Уладзіміраўны выхаванцам дзіцячых садоў №№ 1 і 2.

**Святлана БЯЛЯК. Фота аўтара**

# Галоўнае — высокая якасць і стабільная работа

**Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.**

"Улада, члены ўрада, кіраўніцтва прадпрыемства павінны зрабіць так, каб у вас былі ўмовы для працы. Я не кажу, як некаторыя: перадвыбарная кампанія пачалася ўжо, дык заяўляюць, што з верталёта будуць грошы раскідваць. У нас гэта не праходзіць, у нас людзі разумныя, усведамляюць, што з верталёта толькі лістоўкі можна раскідваць. Я вам гэтага не абяцаю, як гэта папулярна ні гучала б. Ні ў якім разе", — сказаў Прэзідэнт.

Прэзідэнт звярнуў увагу, што важна не толькі вырабляць прадукцыю, але і рабіць гэта якасна, тады не ўзнікне праблем і са збытам. Размова ішла і аб развіцці вытворчасцей за мяжой.

Прэзідэнт наведаў таксама корпус зборкі трактароў, дзе яму далажылі аб вытворчасці розных камплектуючых, якія выпрацоўваюцца для МТЗ на іншых прадпрыемствах па праграме імпартазамяшчэння. Аляксандр Лукашэнка яшчэ раз звярнуў увагу на неабходнасць максімальна сканцэнтраваць на тэрыторыі краіны вытворчасць камплектуючых для МТЗ і скараціць пастаўкі па імпарце. Пры гэтым абавязкова забяспечыць высокую якасць прадукцыі.

Кіраўнік дзяржавы падрабязна цікавіўся станам спраў на асобных прадпрыемствах. Размова ішла аб забеспячэнні стабільнасці работы, наяўнасці рынкаў збыту, пытаннях аплаты працы. "Людзі павінны бачыць святло ў канцы тунэля. Калі яны гэта бачаць, будуць старацца", — адзначыў Прэзідэнт.

## Закон жыцця

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што некаторыя людзі цяпер прапануюць распрадаць дзяржаўныя прадпрыемствы, а атрыманыя грошы накіраваць на рэформы. "Прыгожа гучыць. Але вы разумееце, што я сказаў? Не ўсе. Гэта значыць, што дзяржуласнасць, якая ў нас ёсць, у тым ліку гэты завод (ён жа дзяржаўны), заўтра прададуць і гэтыя грошы накіруюць на нейкія рэформы. Думаю (я ж не першы год Прэзідэнт ужо): напэўна, прададуць, але грошы не пойдуць на рэформы. Мы гэта ўжо бачылі ў Расіі. Грошы раскладуць па кішэнях, будзьце ўпэўнены", — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт падкрэсліў, што павальная прыватызацыя — не яго палітыка, хоць сам ён і не супраць продажу дзяржаўнай уласнасці.

"Я часта ўспамінаю сваю маці, якая мяне з дзяцінства вучыла. Я Прэзідэнтам ужо стаў, а яна мяне ўсё вучыць. Яна мне заўсёды з дзяцінства гаварыла: не бяры чужога. Гэта закон майго жыцця: усё павінна быць справядліва і чужое браць нельга", — дадаў Аляксандр Лукашэнка і падкрэсліў, што не можа проста так распрадаваць дзяржаўную ўласнасць: заводы ж ствараліся калектывамі людзей, папярэднімі пакаленнямі.

## Больш, чым хвароба

Хвароба ў пандэміі каранавіруса займае палову, астатняе — палітыка. Такое меркаванне выказаў Прэзідэнт.

"Я па-ранейшаму прытрымліваюся аднаго прынцыпу: гэта больш, чым хвароба. Хвароба ў гэтай пандэміі займае, можа, палову, а тое і менш. Усё астатняе — гэта палітыка. І вы хутка ў гэтым пераканаецеся", — сказаў Аляксандр Лукашэнка і адзначыў, што пазіцыю Беларусі, якая не стала спыняць вытворчасці ў гэты перыяд, прынялі не ўсе краіны. А некаторыя нават падштурхоўвалі да гэтага. "Мы спынімся. Потым, для таго, каб раскруціцца, разгарнуцца, патрэбны грошы. А ў каго грошы? У Амерыкі, Кітая, крыху ў Расіі і ў іншых. Яны разгорнуцца, прынясуць вам рубель і скажуць: даём рубель, але заводзік — туды. Вось у чым быў палітычны сэнс усяго гэтага. І мы яшчэ многае не бачым з таго, што адбываецца ў свеце, — звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы. — Добра вытворчасці, але што адбудзецца з пункту гледжання існавання той ці іншай дзяржавы? І я не дарэмна сказаў: калі табе дадуць рубель, то запатрабуюць адпаведнай аддачы".

Закранаючы бягучую сітуацыю з каранавірусам у Беларусі, Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што некаторыя бальніцы пачынаюць ужо вяртацца да звычайнага рэжыму работы па сваёй спецыялізацыі.

У той жа час Прэзідэнт канстатаваў, што цяпер у свеце ўжо ўсё больш і больш гавораць аб другой хвалі каранавіруса — успышка прагназуецца на восень. Аднак, лічыць кіраўнік дзяржавы, да гэтага часу многія ў Беларусі перанясуць гэту інфекцыю і выпрацуюць да яе імунітэт. 90 працэнтаў тых, хто захварэў, пераносяць гэта захворванне бессімптомна, адзначыў ён. "Калі мы перахварэлі, нам не трэба баяцца другой хвалі. Але, тым не менш, мы рыхтуемся да ўсяго. Цяпер трацім немалыя грошы. Банк рэканструкцыі, або Сусветны банк, нам ужо выдзеліў 90 мільёнаў долараў, якія мы накіруем на ахову здароўя, каб яшчэ вышэй падцягнуць сістэму і лячыць людзей. Але ўсё толькі дзякуючы таму, што мы з вамі апошнія гады ўкладвалі немалыя грошы ў сістэму аховы здароўя і падрыхтоўку ўрачоў", — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

**Паводле матэрыялаў БелТА**

## *На вопросы — компетентно*

**6 июня с 9.00 до 12.00** состоится «прямая телефонная линия» с заместителем председателя Брестского областного исполнительного комитета

**ГЕННАДИЕМ ИОСИФОВИЧЕМ БОРИСЮКОМ**

по вопросам организации работы социальной сферы (образование, медицина, оздоровление и санаторно-курортное лечение, социальная защита, занятость, культура, спорт и др.).

***Эти и другие волнующие вопросы можно задать по телефону в Бресте (80162)21-31-21.***

**В субботу, 6 июня, с 9.00 до 12.00** состоится «прямая телефонная линия» с председателем районного Совета депутатов

**АНАТОЛИЕМ ВИТАЛЬЕВИЧЕМ ШОЛТАНЮКОМ,** *тел. 25-2-30*.

**В субботу, 6 июня, с 9.00 до 12.00**
состоятся «прямые телефонные линии»:

с председателем Ракитницкого сельисполкома
**ВАЛЕРИЕМ НИКОЛАЕВИЧЕМ АНДРЕЮКОМ,** ***тел. (8033)381-43-65,***
с управляющим делами Озятского сельисполкома
**ЕЛЕНОЙ ВАСИЛЬЕВНОЙ МОРОЗ,** ***тел. (8029)760-45-94,***
с председателем Хмелевского сельисполкома
**СЕРГЕЕМ ЛЕОНТЬЕВИЧЕМ ПРИЛУЦКИМ,** ***тел. (8029)746-14-58,***
с председателем Жабинковского сельисполкома
**НИКОЛАЕМ ВИКТОРОВИЧЕМ ГОЛОВЕЙКО**, ***тел. (8033)374-75-64,***
с председателем Кривлянского сельисполкома
**АНАТОЛИЕМ ФЁДОРОВИЧЕМ МАРЧУКОМ,** ***тел. (8029)841-76-72,***
с управляющим делами Ленинского сельисполкома
**ИРИНОЙ ФЁДОРОВНОЙ ЕФИМОВИЧ,** ***тел. (8029)207-95-30,***
с председателем Степанковского сельисполкома
**ВИКТОРОМ НИКОЛАЕВИЧЕМ МАРКОВИЧЕМ,** ***тел. (8029)774-06-24.***

**6 июня с 09.00 до 12.00** состоится «прямая телефонная линия» с первым заместителем начальника Жабинковского районного отдела по чрезвычайным ситуациям — начальником инспекции надзора и профилактики

**АНДРЕЕМ ВИКТОРОВИЧЕМ ХАРЛАМЕНКОВЫМ.**

***Контактный телефон в г. Жабинка (801641)60-5-11.***